Яўген СКІБСКІ,
вядучы інжынер-праграміст
аддзела суправаджэння інтэрнэт-партала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# ХВАЛІ І ПЛЫНІ ПРАЕКТА "НА ХВАЛІ ЧАСУ, У ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ"

Праект "На хвалі часу, у плыні жыцця", прысвечаны 100-годдзю літаратурнага аб'яднання "Маладняк", – адзін з найбуйнейшых, якія цяпер ажыццяўляюцца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і яе партнёрамі. Шмат працы зроблена – ад артыкулаў у перыядычных выданнях да прэзентацый, ад канферэнцый і круглых сталоў да буйных анлайн-конкурсаў. І сярод іх годнае месца займае раздзел на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Структурна раздзел пабудаваны так: галоўная старонка, дзе сабраны асноўныя звесткі пра "Маладняк", гісторыя літаб'яднання, сферы дзейнасці, падраздзел, прысвечаны найбольш выбітным удзельнікам "Маладняка". На сёння створана дзевяць старонак маладнякоўцаў: Валерыя Маракова, Адама Бабарэкі, Уладзіміра Хадыкі, Уладзіміра Дубоўкі, Кузьмы Чорнага, Яна Скрыгана, Андрэя Александровіча, Алеся Гурло, Змітрака Бядулі і Міхася Зарэцкага. Ідзе праца над новымі. І студэнты, і настаўнікі, і нават літаратуразнаўцы знойдуць там шмат карыснага. Вялікая колькасць матэрыялаў публікуецца ўпершыню.

Ходам рэалізацыі праекта атрымалася наладзіць сувязі з нашчадкамі некаторых маладнякоўцаў. Імі былі перададзены шматлікія дакументы і звесткі пра знакамітых сваякоў.

Цікавы момант – ствараючы раздзелы на партале Нацыянальнай бібліятэкі, ніхто не думаў, што здарыцца пандэмія, але калі яна паралізавала свет, то многія перавагі віртуальных праектаў сталі відавочнымі. Зробленая праца дазваляе пазнаёміцца з матэрыяламі праекта не выходзячы з дому. А паколькі на старонках ёсць алічбаваныя кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, фотаздымкі і дакументы з музеяў, тэксты артыкулаў, то не трэба наведваць установы, а можна вывучаць інфармацыю на ўласным камп'ютары ці іншай прыладзе. Шмат якія матэрыялы можна спампаваць.

Вядома, падобны фармат хоць і важны, але не заўсёды дастатковы. Гісторыя "Маладняка" ці гісторыя канкрэтнага сябра аб'яднання часта маюць белыя плямы. І сярод інструментаў запаўнення прабелаў інфармацыі – канферэнцыі, семінары і г. д., то-бок афлайнавыя мерапрыемствы. І безумоўна, трэба сумяшчаць і развіццё партала, і жывыя навуковыя сустрэчы з улікам неабходных мер бяспекі.

Адсутнасць вялікай колькасці мерапрыемстваў афлайн стала каталізатарам для новых актыўнасцяў, для новых задум. Як вынік – для новых шляхоў развіцця праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця", сярод якіх хацелася б назваць тры.

Па-першае, **развіццё і ўдасканаленне ўжо існых частак праекта, а таксама стварэнне новых**. Да 2023 г. – 100-годдзя "Маладняка" – запланавана, што будуць раздзелы, прысвечаныя больш як дваццаці выбітным пісьменнікам. Думаю, праца не спыніцца нават пасля 2023 г., таму што з'яўляюцца новыя артыкулы, кнігі, фільмы, прысвечаныя маладнякоўцам. А таксама адкрываюцца новыя імёны незаслужана забытых аўтараў.

Па-другое, узнікаюць **цікавыя дадатковыя праекты** вакол асноўнага. Сярод іх анлайн-конкурс чытальнікаў вершаў Уладзіміра Дубоўкі "О Беларусь, мая шыпшына", у якім удзельнічалі больш за 880 аматараў паэзіі з розных куткоў Беларусі і нават з іншых краін. У снежні 2021 г. былі абвешчаны вынікі ўжо другога літаратурнага спаборніцтва, конкурсу эсэ "Беларускі салавей". У ім таксама ўдзельнічалі больш за 800 школьнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў і проста аматараў літаратуры.

З'яўляюцца і іншыя праекты, напрыклад, быў падрыхтаваны і ўжо ўбачыў свет зборнік вершаў "Страшна не пачуць голас твой", прысвечаных "Маладняку", сябрам літаб'яднання, іх няпростаму лёсу.

І трэцім магчымым шляхам развіцця праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця" можа быць **геаграфічнае пашырэнне**. Напрыклад, стварэнне структуры адпаведных раздзелаў на сайтах рэгіянальных бібліятэк. "Маладняк" меў шырокую сетку філій. На партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ёсць інфармацыя пра "Маладняк", пра заснавальнікаў, найбольш выбітных сяброў, а на сайтах рэгіянальных бібліятэк (ці іншых устаноў культуры) можна стварыць раздзелы, прысвечаныя дзейнасці менавіта мясцовых філій, мясцовых літаратараў – сяброў літаб'яднання. Безумоўна, у гарадах і іншых населеных пунктах ушаноўваецца памяць пісьменнікаў, якія нарадзіліся там. Напрыклад, добра вядомая плённая праца Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі і г. д. Але ідэя стварыць абагульняльную структуру падаецца цікавай.